УДК 94(476) «1941»

# ЭВАКУАЦЫЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ БССР ЛЕТАМ 1941 г.

**Сугака Леанід Аляксандравіч**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і ўсходніх славян Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)

У выніку катастрафічных для савецкіх войскаў першых дзён Вялікай Айчыннай вайны з гітлераўскай Германіяй і іх вымушана-



архив библиотеки МГУ имени А

га адступлення ўзнікла вострая неабходнасць пачаць эвакуацыю ў прыфрантавых рэгіёнах Савецкага Саюза. У Беларусі эвакуацыйныя мерапрыемствы летам 1941 г. ахапілі галоўным чынам яе ўсходнюю частку (Віцебскую, Магілёўскую, Палескую і Гомельскую вобласці) і ўключалі дзейнасць па перамяшчэнню ў тылавыя раёны СССР насельніцтва, абсталявання прамысловых прадпрыемстваў, гатовай прадукцыі, сыравіны і паўфабрыкатаў, паліва, харчавання, матэрыяльных рэсурсаў сельскай гаспадаркі, жывёлы, транспартных сродкаў, маёмасці сістэмы сувязі і г.д.

Адзначым, што культурныя каштоўнасці (да іх аднясем і адпаведную маёмасць адукацыйных устаноў) у пералік прыярытэтаў эвакуацыйнай палітыкі не трапілі. Нават у дакументах, якія закраналі пытанні эвакуацыі, паняцце «культурныя каштоўнасці» не прапісвалась асобна, а ўключалася ў дастаткова размытую катэгорыю «и другие государственные ценности» [1, с. 201]. Такія адносіны да праблемы выратавання культурнага багацця можна растлумачыць, з аднаго боку, экстрэмальнымі ўмовамі пачатку вайны, калі дадзены аспект апынуўся на перыферыі ўвагі ўладаў, якія вымушаны былі аператыўна вырашаць шмат іншых, неадкладных і цяжкіх пытанняў. Напрыклад, звязаных з правядзеннем мабілізацыі, забяспячэннем войскаў, будаўніцтвам абарончых пазіцый, фарміраваннем атрадаў народнага апалчэння і знішчальных батальёнаў, падрыхтоўкай да партызанскай і падпольнай барацьбы і г. д. З другога боку, такі быў узровень адукаванасці і культуры шмат каго з прадстаўнікоў партыйна-дзяржаўнага аппарату. Таму зразумела, чаму, адпаведна афіцыйным дадзеным, колькасць цалкам альбо часткова эвакуіраваных з Беларускай ССР адукацыйных структур нязначна – толькі 20 сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў [2, с. 647; 3, с. 123]. Агульнаадукацыйныя школы, як бачым, вогуле не ўзгадваюцца. Пры гэтым нават на ўсходзе рэспублікі зафіксаваны факт, калі цэлая вышэйшая навучальная ўстанова – Аршанскі настаўніцкі інстытут – апынулася ў руках ворага разам з усімі абсталяваннем, маёмасцю і бібліятэчным фондам [4, арк. 1–2]. А ў Гомелі для эвакуацыі педагагічнага інстытута імя Чкалава накіравалі ўсяго толькі 6 вагонаў, у якіх у г. Яранск Кіраўскай вобласці адправілі частку абсталявання кабінетаў і лабараторый, 15 тыс. кніг [5, с. 45; 6, с. 170].

У абагульняючых даведках, дзе адлюстраваны вынікі эвакуацыі ў БССР, не канкрэтызуецца, менавіта якія навучальныя ўстановы рэспублікі былі адпраўлены на ўсход. Даецца толькі іх агульная колькасць (20). Аўтар гэтых радкоў паспрабаваў, на падставе архіўных дакументаў, публікацый і дадзеных інтэрнэт-рэсурсаў, сабраць і сістэмазаваць адпаведную інфармацыю. Звесткі аб вядомых нам 11 эвакуіраваных установах адукацыі Беларусі прадстаўлены ў табліцы.

Пры размяшчэнні ў тыле некаторых устаноў не абышлося без арганізацыйных праблем. Так, у адпаведнасці з распараджэннем Савета па эвакуацыі пры СНК СССР ад 20 ліпеня 1941 г. вывезены з Віцебска ў Кіраў ветэрынарны інстытут павінен быў размясціцца на плошчах мясцовага заатэхнічнага інстытута. Аднак пастановай Дзяржаўнага камітэта абароны ад 30 ліпеня 1941 г. гэтыя ж памяшканні перадаваліся для арганізацыі завода патронаў № 537. У выніку беларускі інстытут «раскідалі» па ўсяму гораду [8, арк. 2].

Такім чынам, на сённяшні дзень мы маем далёка ня поўныя звесткі аб эвакуацыі навучальных устаноў Беларускай ССР летам 1941 г. Акрамя таго, трэба мець на ўвазе, што некаторыя адукацыйныя структуры рэспублікі маглі перажыць новую эвакуацыю ў 1942 г. Гаворка ідзе аб віцебскіх швейна-трыкатажным тэхнікуме і палітэхнікуме, якія апынуліся ў Саратаве, а таксама часткі вучэбнага абсталявання і маёмасці Беларускага сельскагаспадарчага інстытута (г. Горкі), што прыбыла ў Варонеж. Летам 1942 г., ў сувязі з буйным наступленнем нямецкіх войскаў на паўднёвым крыле Ўсходняга фронту, пачалася «другая хваля» савецкай эвакуацыі, ў полі якой аказаліся вышэй памянёныя расійскія гарады, і, адпаведна, беларускія адукацыйныя ўстановы, што там знаходзіліся. Азначаныя акалічнасці робяць актуальнай задачу далейшага даследавання дадзенага аспекта «эвакуацыйнага» пытання перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

**Эвакуацыя ўстаноў адукацыі БССР летам 1941 г.**

| Назва навучальнай установы | Статус навучальнай установы | Размяшчэнне на 22.06.1941 г. | Пункт эвакуацыі | Эвакуіраваныя кадры, маёмасць і каштоўнасці |
|---|---|---|---|---|
| 1. Беларускі сельскагаспадарчы інстытут | Вышэйшая | Горкі | Варонеж, Свярдлоўск | Прыборы, абсталяванне, дакументацыя |
| 2. Педагагічны інстытут імя Чкалава | Вышэйшая | Гомель | Яранск Кіраўскай вобл. | Абсталяванне кабінетаў і лабараторый, 15 тыс. кніг |
| 3. Лесатэхнічны інстытут | Вышэйшая | Гомель | Свярдлоўск | Звесткаў няма |
| 4. Педагагічны інстытут імя Кірава | Вышэйшая | Віцебск | Не ўказаны | Частка абсталявання кабінетаў і лабараторый |
| 5. Медыцынскіінстытут | Вышэйшая | Віцебск | Чалябінск | Звесткаў няма |
| 6. Ветэрынарны інстытут | Вышэйшая | Віцебск | Кіраў | Звесткаў няма |
| 7. Швейна-трыкатажны тэхнікум | Сярэдняя спецыяльная | Віцебск | Саратаў | Абсталяванне вучэбных майстэрняў |
| 8. Палітэхнікум | Сярэдняя спецыяльная | Віцебск | Саратаў | Абсталяванне і матэрыялы вучэбных майстэрняў |
| 9. ФЗВ абутнікаў | Сярэдняя спецыяльная | Віцебск | Кунгур | 25 чалавек, абсталяванне і матэрыялы |
| 10. Школа ФЗН № 4 | Сярэдняя спецыяльная | Магілёў | Не ўказаны | Металарэжучыя станкі, эл.-маторы |
| 11. Музычнае вучылішча | Сярэдняя спецыяльная | Гомель | Уфа | Звесткаў няма |

[7, арк. 3–6, 10–11; 8, арк. 2; 5, с. 45; 6, с. 170; 9, с. 114; 10, с. 76–77; 11; 12; 13, табліца складзена аўтарам].

ЛІТАРАТУРА


1. Из истории Великой Отечественной войны. Начало войны (22–30 июня 1941 г.) / Известия ЦК КПСС. – 1990. – № 6. – С. 196–222.
2. *Аляхновіч, Г. І.* Эвакуацыя / Г. І. Аляхновіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыкл. / гал. рэд. І. П. Шамякін. – Мінск, 1990. – С. 646–647.
3. *Павлов, Я. С.* В суровом сорок первом / Я. С. Павлов. – Минск : Беларусь, 1985. – 272 с.
4. Занальны дзяржаўны архіў у г. Ворші (ЗДАВ). – Ф. 646. Воп. 1. Спр. 8.
5. *Зеленкова, А. И.* Гомельский педагогический институт им. В. П. Чкалова накануне и в годы Великой Отечественной войны / А. И. Зеленкова, М. П. Савинская // 1941 год в истории Беларуси: к 70-летию начала Великой Отечественной войны : сб. статей Респ. воен.-ист. конф., Минск, 1 июня 2011 г. / Воен. акад. Респ. Беларусь ; редкол.: А. А. Киселёв [и др.]. – Минск, 2012. – С. 39–48.
6. Гомельская область в первые месяцы Великой Отечественной войны : док. и материалы / Нац. архив Респ. Беларусь / сост. В. Д. Селеменёв [и др.] ; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. – Минск, 2010. – 272 с.
7. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 102. Воп. 3. Спр. 2.
8. Государственный архив Российской Федерации (ГАРФ). – Ф. р-6822. Оп. 1. Д. 187.
9. *Кузьменко, В. И.* Учёные БССР в военное время / В. И. Кузьменко, Н. В. Токарев // Беларусь. 1941–1945: Подвиг. Трагедия. Память : науч. изд. : в 2 кн. / Ин-т истории НАН Беларуси ; под ред. А. А. Ковалени. – Кн. 2. – Минск, 2010. – С. 114–131.
10. *Олехнович, Г. И.* Трудящиеся Белоруссии – фронту / Г. И. Олехнович. – Минск : Изд-во БГУ, 1972. – 208 с.
11. Витебский государственный университет имени П. М. Машерова – ВГУ // Витебск: Высшие учебные заведения Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.vuz.univer.by/vitebsk. – Дата доступа: 9.03.2014.
12. История ВГМУ // Витебский государственный ордена Дружбы народов медицинский университет [Электронный ресурс]. – Режим доступа: www.vsmu.by/ru/about-vsmu/history.html. – Дата доступа: 9.03.2014.
13. Учреждение образования “Гомельский государственный колледж искусств имени Н. Ф. Соколовского” // Колледж искусств имени Н. Ф. Соколовского (Гомель) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: wikimapia.org/24671504/ru/Колледж-искусств-им-Н-Ф-Соколовского. – Дата доступа: 10.03.2014.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова